ков танца. Незнание традиционных норм воплощения танцевальной традиции как исполнительского творчества приводит к хаотическому набору хореографических элементов.

Обучение народной хореографии в условиях праздника может происходить увлекательно и продуктивно в силу ее «доступности» и пластичности. Игровая сфера хореографии предполагает такую демократию и равенство всех ее членов, что создает большие возможности для индивидуального творчества. Исполнитель становится творцом общей для всех художественно-оформленной игры.

Таким образом, народный танец – это результат коллективного творчества, средство создания своей танцевальной культуры и приобщения к всеобщей народной культуре. Переходя от исполнителя к исполнителю, из поколения в поколение, из одной местности в другую, он обогащается, достигая в ряде случаев высокого художественного уровня, виртуозной техники.

1. *Алексютович, Л. К.* Белорусские народные танцы, хороводы, игры / Л. К. Алексютович ; под ред. М. Я. Гринблата. – Минск : Выш. шк., 1978. – С. 7–8.

2. *Моисеев, И. А.* Балет: Энциклопедия / И. А. Моисеев. – М., 1981. – С. 363.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ПРАБЛЕМА ІДЭНТЫФІКАЦЫІ АСОБЫ У СВЯТЛЕ ФІЛАСОФСКА-КУЛЬТУРАЛАГІЧНЫХ ДАСЛЕДАВАННЯЎ

***У. Ф. Красюк,***
*кандыдат філасофскіх навук, дацэнт*
*Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў*

Рэаліі сённяшняга дня задаюць шэраг пытанняў, карані якіх знаходзяцца ў глыбіні сівых вякоў, аднак яны набываюць актуальнасць з нагоды абвастрэння духоўна-культурных падзей у сітуацыі крызісу сучаснай тэхнагеннай цывілізацыі, «заняпаду Еўропы».

Парадокс сітуацыі ў тым, што дэградацыя духоўных канонаў супадае з росквітам нябачаных дагэтуль тэхнічных дасягнен-

няў, што надае культурным працэсам ненатуральны, штучны, часам скажоны характар.

Мае месца і дыверсіфікацыя поглядаў на сутнасць чалавека, калі мяняюцца ўяўленні аб ідэнтыфікацыі асобы. Праблема актуалізуецца надзённымі падзеямі, калі гаворка ідзе аб суадносінах «душы і цела» – магчымасцях суіснавання свядомасці і яе цялеснага субстрату, аб патэнцыяльным пераносе свядомасці на электронныя носьбіты, аб існуючай практыцы перамены полавай прыналежнасці, аб ментальных асаблівасцях аднаполых шлюбаў, аб эзатэрычных практыках «выхаду душы» з цела і г. д.

Такога кшталту штукарствы ляжаць у полі інтарэсаў розных навук, а таксама рэлігіі, палітыкі, культуры. Для філасофскага асэнсавання перш за ўсё маюць значнасць светапоглядныя аспекты праблемы.

Антычныя грэкі ўсур'ёз лічылі, што людзі спачатку былі андрагінамі. Аб'яднанне мужчынскага і жаночага пачаткаў не раздвойвала чалавечую істоту, а, наадварот, быццам надавала ёй гарманічнасць. Усім сёння вядомы словы пра сужэнцаў як пра дзве палавінкі, якія ўзаемадапаўняюць адзін аднаго.

У наш час праблема ідэнтыфікацыі асобы абвастраецца. Рознымі адхіленнямі, напрыклад псіхасаматычнага і паталагічнага плана, займаюцца псіхалагічныя і блізкія да іх навукі. Аднак не меншую значнасць маюць і аспекты светапогляднага, этыкасацыяльнага і культуралагічнага плана даследаванняў.

Псіхолагі і псіхапатолагі гавораць пра раздваенне асобы. Раздваенне можа быць ў плане маралі, палітычных прыхільнасцей, культуры, асабліва ў перыяд крызісных сітуацый, у якія пападаюць асоба ці грамадства. Сення, калі свет становіцца ўсе больш няўстойлівым, зноў і зноў прыходзіцца вяртацца да пытання ідэнтыфікацыі асобы: заходнія міністры-мужчыны, зоркі эстрады і культуры, таксама мужчыны, выходзяць замуж і наадварот; камп'ютэрныя «актывісты» добра атабарыўшыся ў віртуальнай рэальнасці не могуць вызначыць свое «Я» ў сапраўднасці – у «рэале»; на сцэнах тэатраў і на тэлебачанні набываюць папулярнасць «новыя бабкі», зноў жа мужчыны. Поспехі медыцыны па трансплантацыі чалавечых органаў усё выразней напамінаюць міф пра Тэзея, які па дошцы замяніў увесь карабель. Паўстае пытанне: карабель той самы ці гэта



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ўжо новы карабель? А калі ў чалавека замяніць па неабходнасці ўсе органы (скажам, арганізм быў падлеглы празмернаму апраменьванню), то хто ёсць гэты чалавек? Ці поўнасцю, зноў жа, перакадзіраваць яго свядомасць, тым больш перамяніць самасвядомасць Іванова і Пятрова, якія ўжо будуць у новых «мундзірах»?

Мы прыйшлі ў тэатр «на любімага акцёра». Высветлілася: яму памянялі цела; значыць, у яго другія рухі, жэсты, гульня, імправізацыя, міміка. Фізіялогія новага цела адаб'ецца на фарміраванні псіхалагічных актаў. Як у новых варунках праявіцца талент акцёра? Тут месца сутыкнення пазіцый Лока з яго тэзісам: «свядомасць чалавека – першапачаткова чысты ліст паперы» – і Уілсана, які сказаў бы, што першапачатковы талент акцёра прапаў бы, бо ў новым «мундзіры» адбывалася б аберацыя задумак. «Што б я не рабіў, імкнучыся ўявіць сябе з целам, голасам, выразам твару, успамінамі, эмоцыямі і вопытам другога чалавека, становішча каторага мне чужаснае і невядомае, і меркаваў, што такое дзеянне можа прынесці карысць у рэальнай палітыцы, есць чысты абсурд» [2, с. 142]. Да таго ж павярхоўнасць тэстаў са зменай роляў непрымальная, бо парушае прынцып разумнасці і натуральнасці. У рэчышчы суджэнняў Уільямса можна прывесці наступны прыклад: чалавеканенавіснік мог бы з захапленнем лічыць, што калі б ён стаў непаўнавартасным, то яго патрэбна было б забіць, знічтожыць, каб выратаваць свет. Калі «Я» глыбока ўкаранёнае ў сваей культуры, штодзённасці, звычках, то гэтая ўкараненасць у другім целе не можа быць рэалізавана. Для старажытных грэкаў свет без рабства быў немыслімы, як і змена «гэтага» грамадства другім. Значыць, лічыць Уільямс, немагчыма «маё» пераўтварэнне ў другога чалавека.

Сёння светапоглядная праблема свайго «Я» абвастраецца. Задача стварэння штучнага інтэлекту ў сваім вырашэнні немінуча паставіць пытанне аб яго ідэнтыфікацыі. Ужо сення псіхолагі б'юць трывогу адносна растварэння асобнасці камп'ютэрных «фанатаў» у віртуальнай прасторы: яны хутчэй атаясамліваюць сябе з надуманымі запраграміраванымі вобразамі, чым са сваім рэальным пачуццева–фізічным абліччам. А гэта стварае пагрозу псіхалагічнай раўнавазе, вядзе да хваравітай паталогіі.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Што датычыцца педагогаў, то яны даўно вырашаюць праблему дысбалансу ў псіхіцы дзяцей, калі бацькі па розных прычынах хлопчыкаў выхоўвалі як дзяўчынак і наадварот.

Неад’емнай часткай сенняшняй медыка-біялагічнай навукі з’яўляецца генная інжынерыя. Яе штукарствы мала таго, што ствараюць пагрозы існаванню натуральнаму, прыроднаму, біялагічнаму матэрыялу, але і генерыруюць небяспеку стварэння монстраў у плане кентаўрыстыкі, пачварнага сімбіёзу, што ў адносінах да людзей стварае прэцэдэнт немагчымасці ў плане іх ідэнтыфіцыруемасці.

Сучасныя навуковыя даследаванні ставяць пытанне аб практычнай рэалізацыі ідэі стварэння штучнага інтэлекту. Згодна з хрысціянскай традыцыяй, зноў жа, чалавек ёсць сукупнасць трох элементаў: духа, душы і цела. Устае пытанне: штучны розум асяняецца духам Божым? Ці ўласціва яму душа? І наогул, ягонае электроннае існаванне мае прэтэнзіі на статус жыцця? Суперскладаныя працэсы ў інфармацыйных сістэмах, набыўшы незалежнасць ад чалавека, ствараюць новую рэальнасць, іншы від быцця. Аднак яшчэ не зразумела ці адносіцца яно да той выпрацаванай чалавекам з’явы, якую прынята называць культурай?

Даўно ўжо гаворыцца пра магчымасць пераносу свядомасці асобы на электронныя чыпы. Уявім сабе сітуацыю: па нейкім медыцынскім прычынам мозг чалавека не можа «ўжыцца» са сваім целам. У здаровае цела, якое спраўна функцыяніруе, устаўляюць штучны мозг, скапіраваны з сапраўднага чалавека, а сапраўдны ўстаўляюць у штучнае цела. Дзе асоба? Спасылкі на асобаснасць, спецыфіку суб’ект-аб’ектных адносін тут стандартна не спрацуюць. І наогул, з улікам вышэй сказанага, што яўляе сабой экзістэнцыяльнае «быццё-ў-свеце»? Чыё быццё? У якім свеце?

Сёння медыцынская навука ўшчыльную падышла да практычнай рэалізацыі магчымасцей перасадкі часткі галаўнога мозга чалавека і ўсур’ёз рыхтуецца да трансплантацыі мозга цалкам. Да таго ж віруюць ідэі стварэння кібаргаў. Трансгуманізм сцвярджае вычарпанасць магчымасцей нашага арганічнага цела, маўляў, неабходна пераадолець яго новымі тэхналогіямі ў напрамку патэнцыяльнай бессмяротнасці. Для гэтага падыйдуць і трансгенныя матэрыялы, і палімерныя рэсурсы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

А калі на сучасным этапе развіцця навукі нешта яшчэ не ўдаецца – не бяда. Поспехі крыонікі даюць магчымасць вырашыць праблему ў будучым. Зноў пытанне: якімі будуць суб’ект-аб’ектныя стасункі, дзейнасць мозгу, функцыянаванне псіхікі і свядомасці «пасля размарозкі». Па ідэі, «душа» як быццам тая ж самая, а вось адчуванне, свядомае ўсведамленне сябе і свету яшчэ не вядома якое. Магчыма, гэта будзе падабенства рэінкарнацыі. Дарэчы, у будызме душа, «перасяліўшыся» ў новае цела, застаецца як бы сама сабою, а вось свядомасць істоты змяняецца, перабудоўваецца, нібы калейдаскоп.

Сёння мае месца канвергенцыя навук і тэхналогій, гэта новы этап навукова-тэхнічнага развіцця. Так званыя НБІКС-тэхналогіі аказваюць усеахопліваючае ўздзеянне на эвалюцыю геннай інжынерыі, якая змяняе генетычную базу арганізмаў, якія да таго ж выпрабоўваюць уздзеянне ГМА. Гэта, безумоўна, адаб’ецца на асаблівасцях псіхасаматычнай дзейнасці, на яе варыятыўнасці. Зноў жа пытанне: а як быць з «калектыўнай памяццю» К. Юнга? Змяняецца ж геном як характарыстыка віду, у дадзеным выпадку біялагічна абумоўленай сукупнасці людзей – народа. Патэнцыяльная страта калектыўнай памяці паглыбляе ўзровень страты ідэнтычнасці асобы, і больш таго – прыналежнасці да свайго этнасу.

Праблема ідэнтычнасці асобы самой сабе − праблема анталагічная. Тут да месца пытанне: што ёсць існаванне асобы? І таксама: існаванне каго? Што ёсць сама асоба? У свой час Э. Жыльсон адзначыў, што пад існаваннем мы разумеем становішча таго, што, валодаючы асабістым быційным дзеяннем, тым самым выдзяляецца з быцця. Існае – гэта тое, што знаходзіцца ў стане ці ўмовах існавання. Светапогляднае разуменне гэтых пытанняў мае значнасць як для асобы, якая сутыкаецца з такімі праблемамі, так і для людзей, што наўкол яе.

Пастаноўка нетрадыцыйных пытанняў па нетрадыцыйных з’явах – ёсць тая сфера, дзе гэтыя пытанні, што спакваля прыярытэтны для спецыяльных навук, патрабуюць філасофскага асмыслення і абаснавання. Сёння ў навуцы акрэсліваецца з’ява, якая атрымала назву «фарсайт». Гэта працэс планамернага фарміравання будучага ў адпаведнасці з комплекснымі «дарожнымі картамі», якія распрацоўваюцца сумеснымі намаганнямі экспертаў з розных сфер дзейнасці і галін навукі. Не вы-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ключана, што разглядаемыя сённяшнія пытанні ў будучым прымуць новыя формы. Венчурная навука патрабуе рызыкі і непрадугледжаных інвестыцый, калі цесна пераплятаюцца факты і супярэчнасці, пошукі і выпрабаванні, этычныя каштоўнасці і непрадбачанае. Філасофскае абаснаванне праблемы ідэнтыфікацыі асобы ў гэтым плане мае значнасць як ў агульным светапоглядным аспекце, так і ў персаналісцкім ракурсе, бо кожнае жыцце ўключаецца ва ўсеагульны сусветны парадак, у чым выяўляецца яго сэнс .

Па словах І. Канта, філасофія спрабуе пазнаць такія праблемы, каторыя вызначаюць усё аблічча чалавека, і тым самым задавальняе яго «невынішчальную патрэбнасць» у пошуку сэнсу свайго існавання. Для асобы, перад якой стаіць праблема вызначэння сваей ідэнтычнасці, першасную значнасць мае патрэба быць суб’ектам быцця. Быць суб’ектам – значыць генерыраваць сэнсы, якія атрымліваюць водгук, выбрана адгукаючыся на сэнсы, з якімі сутыкаешся сам. У гэтым праяўляецца рэальнасць асабістага быцця.

Сродкам пошуку і зацвярджэння сэнсу з’яўляецца, напрыклад, мастацтва, у творах якога «сустракаюцца» мастак і глядач, нават тады, заўважым, калі яны аддалены адзін ад аднаго эпохамі і ў іх розны інтэлектуальны патэнцыял. Як пісаў Э. Жыльсон, «прыгажосць егіпецкіх жывапісных выяўленняў, размаляваных грэчаскіх ваз, этрускіх люстэркаў, кітайскага, японскага ці індыйскага жывапісу аказвае на нас нечакана моцнае ўздзеянне; аднак што мы ведаем аб іх аўтарах, часе стварэння, цывілізацыйных ці рэлігійных вераваннях, запозненымі сведкамі каторых яны з’яўляюцца?» [1, с. 310].

Да разглядаемай праблемы падыходзяць словы Ж. Дэлёза пра тое, што дараванне сэнсу адбываецца ў вобласці, якая папярэднічае ўсякаму цвярозаму розуму і ўсякаму агульназначымаму сэнсу.

Псіхалагічныя і звязаныя з імі іншыя навукі ў прыкладным рэчышчы б’юцца над згаданай праблемай. Аднак у суадносінах «душы і цела» не ўсё ляжыць на паверхні ўяўленняў, якімі займаюцца навукі, што даследуюць псіхасаматычныя працэсы. Тут патрэбен яшчэ і абстрагійна-абагульняючы падыход. Філасофія і яўляе сабою рух чалавечага розуму да самога сябе. Адна з задач філасофскага мыслення – выяўленне сувязей у сістэме з’яў там, дзе такая сувязь яшчэ наяўна не праглядаецца.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Таму «ўдзел» філасофіі ў вырашэнні праблем ідэнтыфікацыі асобы, якія відавочна набываюць усе большую значнасць, у сукупнасці з прыкладнымі навукамі, бязумоўна, актуалізуецца. Сінергія пошуку павінна высвятліць таямнічыя пытанні свядомасці, якая не павінна стаць сімулякрам. Гэта азначае, што патрэбна асмысленне праблемы ў культуралагічным плане, а менавіта: наколькі ўмяшальніцтва ў прыроду чалавека скажацца на яго культурным абліччы? Ці ўпішацца гэта ў пазітыўны працэс культуратворчасці.

У тым і прызначэнне культуры – не згасіць, а акрэсліць у хаосе з'яў менавіта чалавечы змест быцця. І загадзя паставіць пытанне: «А што мы робім з сабою?» Бо, як казаў Г. Рыкерт, ніколі жыцце не стане мудрым, а мудрасць жывой.

Пытанне І. Канта, што ёсць чалавек, даўно ўжо выйшла за межы філасофіі. Яно набыло агульнакультурны сэнс. Калі раней «чалавеказнаўствам» у асноўным займалася рэлігія, то цяпер гэта стала важнейшай сферай дзейнасці палітыкі. На высокім урадавым узроўні, у парламенцкіх дэбатах, на рэферэндумах абмяркоўваецца шырокае поле пытанняў: праблемы абортаў, кланіравання, геннай інжынерыі, эўтаназіі, аднаполых шлюбаў, смяротнага пакарання і многія другія. І ўсе яны ўпіраюцца ў асноўную праблему – вызначэнне сутнасці чалавека.

У гэтым вызначэнні ў апошні час адбываюцца сутнасныя змены, якія цягнуць за сабою перагляд многіх акалічнасцей быцця чалавека – ад эканамічных, прававых да светапоглядных, этычных, эстэтычных. А перамены ў вызначэнні чалавечай сутнасці непазбежна прывядуць да перамен у вызначэнні сутнасці культуры, бо ў культуры і адбываецца самавызначэнне чалавека.

___________

1. *Жильсон, Э.* Живопись и реальность / Э. Жильсон ; пер. с франц. – М. : РПЭ (РОССПЭН), 2004. – 368 с. (Серия «Книга света»).

2. *Уилсон, К.* Уильямс / К. Уилсон // 12 ведущих философов современности / Т. Болдуин [и др.] ; под ред. К. Белшоу, Г. Кемпа ; пер. с англ. А. Н. Анваера. – М. : АСТ ; 2014. – 414 с. – (Новая философия).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ